ЛИТЕРАТУРА

1. Фурман, А.В. Основи гендерної рівності: навчальний посібник/А.В. Фурман, Т.Л. Надвинична. – Тернопіль: Економічна думка, 2006. – 168 с.
2. Исаев, Д.Н. Половое воспитание детей: медико-психологические аспекты; [изд. 2-е, перераб. и доп.]/Д.Н. Исаев, В.Е. Каган. – Л.: Медицина, 1988. – 160 с.
3. Говорун, Т.В. Гендерна психологія: навчальний посібник/Т.В. Говорун, О.М. Кікнежді. – К.: Видавничий центр "Академія", 2004. – 308 с.
4. Кон, И.С. Ребенок и общество: учеб. пособие/И.С. Кон. – М.: Академия, 2003. – С. 207-208.
5. Літвінова, О.В. Гендерна психологія: навч. посібник для студентів вищих навчальних закладів/О.В. Літвінова. – Луганськ: Видавництво СНУ ім. В. Даля, 2010. – 236 с.
6. Горностай, П.П. Личность и роль: ролевой подход в социальной психологии личности/П.П. Горностай. – К.: Интерпресс ЛТД, 2007. – С.121-130.

***Ю.М. Лук'янюк, Л.Г. Шасцярнёва***

## ВОБРАЗ ЖАНЧЫНЫ Ў ПРАВАСЛАЎНЫХ МАТЫВАТАРАХ

У цяперашні час актыўнасць жанчын становіцца заўважнай ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, уключаючы палітыку і бізнэс. Многія прафесіі, якія лічыліся ў мінулым "мужчынскімі", пераўтварыліся ў "жаночыя", напрыклад, прафесія школьнага настаўніка, бухгалтара, лекара. Аднак дамінаванне мужчын захоўваецца – сярэдні заробак жанчын ніжэйшы, мужчынам аддаюць перавагу пры працаўладкаванні на высокія пасады і г.д. Для сучаснага грамадства характэрна наяўнасць такіх праблем, як няпоўныя сем'і, няроўныя шлюбы (па ўзросце, па сацыяльным становішчы і інш.), папулярнасць грамадзянскіх шлюбаў сярод моладзі, насілле ў сям'і, распаўсюджанасць жаночых медыявобразаў «Cosmo-girl» і «жанчына-Vogue». Таму, на наш погляд, узнікае неабходнасць супрацьпаставіць ім вобраз «ortho-woman» (дзяўчыны ці жанчыны), якi выдатна ўпісваецца ў сучасныя рэаліі, але абапіраецца на вечныя каштоўнасці, што прапаведуюцца Праваслаўем.

Пытанням месца і ролі жанчыны ў розных рэлігіях прысвечаны шматлікія працы айчынных і замежных аўтараў. У працах Піфагора, Платона і Арыстоцеля змяшчаецца меркаванне аб пераважаючым становішчы мужчыны і падпарадкаванай ролі жанчыны. У эпоху Сярэднявечча таксама распаўсюджаны ідэі аб непаўнавартасці жанчыны, падкрэсліваюцца яе негатыўныя якасці. Паралельна сцвярджаецца ідэі аб дамінаванні мужчын у сям'і і ў грамадскім жыцці. Пачынаючы з Новага часу, у сацыяльна-філасофскіх канцэпцыях выказваюцца меркаванні аб раўнапраўі мужчын і жанчын.

Сёння ў нашай медыяпрасторы з'явіўся праваслаўны жаночы «Славянка», на старонках якога і абмяркоўваюцца пытанні: "Якая яна сучасная праваслаўная жанчына, чым жыве? Ці можна ёй хадзіць на працу, ці яе доля – знакамітыя «тры К» (Kinder, Kirche, Kuchen)? Чаму яна дома павінна слухацца мужа? Ці заўсёды яна павінна хадзіць у хустцы і з малітвасловам, ці можна ёй рабіць прычоску і макіяж? Як пазнаць у натоўпе праваслаўную жанчыну?" (http://www.slavianka.com).



Праваслаўная царква актыўна ўзаемадзейнічае з моладдзю не толькі ў рэальным жыцці (дзейнічаюць розныя сацыяльныя праекты, нядзельныя школы, арганізуюцца падарожжы па святых мясцінах і г.д), але і ў віртуальнай прасторы. Так, сёння вялікую папулярнасць сярод моладзі набываюць такія сацыяльныя сеткі, як «Аднакласнікі», «Facebook», «УКантакце», у межах якіх існуюць групы «Православная женщина», «Krynica.info – Хрысціянскі інфармацыйны партал», «Василий Великий, Библейские обетования», «Доброе

слово •Православие•», «Поколение» (праваслаўны часопіс), Православная молодёжь», «Вера и дело», «Православная молодёжь Мира сего», блогі святароў, праваслаўныя форум. Напрыклад, праект «Батюшка онлайн» (у групе 1.750 чалавек) мае вельмі цікавы кантэнт: ёсць і фотаздымкі, і артыкулы на праваслаўныя тэмы, і апытанкі і нават арыгінальныя відэаінтэрв'ю з веруючымі. Сваёй мэтай інтэрнэт-праект абвясціў усімі даступнымі шляхамі дастукацца да маладых сэрцаў такім незвычайным, але ўсё ж сучасным спосабам. У апісанні групы гаворыцца: "Цяперашняя моладзь жыве анлайн, часцяком аддаючы перавагу віртуальнаму жыццю, а не рэальнаму. Святары праваслаўнай царквы вырашылі пайсці ім насустрач, і самі выйшлі на абшары сусветнага сеціва [1]. Не можам не адзначыць у нашай працы самую папулярную праваслаўную сацыяльную сетку "Еліцы". Высь што пішуць пра яе на партале http://www.pravoslavie.ru: "Праваслаўная сацыяльная сетка «Еліцы», якая з'явілася на прасторах інтэрнэту па благаславенні Святейшага Патрыярха Кірыла ў маі 2014 года, прыцягвае да сябе ўвагу ўсё больш праваслаўных хрысціян з усяго свету. Колькасць карыстальнікаў сацыяльнай сеткі, як паказваюць адкрытыя дадзеныя, рэгулярна павялічваецца" [3]. Зыходзячы з вышэйсказанага, ёсць усе падставы сцвярджаць аб існаванні праваслаўнага кантэнту ў інтэрнэце.

Дзейнасць царквы ў сучасным грамадстве накіравана перш за ўсё на папулярызацыю хрысціянскіх ідэй і каштоўнасцей, захаванне хрысціянскіх запаведзей. Інфармацыйная місія – гэта праваслаўнае асветніцтва самых шырокіх пластоў насельніцтва праз усе даступныя сродкі масавай інфармацыі, а таксама праз арганізацыю прыхадскіх бібліятэк і выданне спецыяльнай місіянерскай літаратуры. Для плённай работы неабходна актыўна асвойваць інфармацыйную прастору, выкарыстоўваючы ўсю разнастайнасць найноўшых інфармацыйных тэхналогій. Менавіта таму сёння інтэрнэт стаў неад'емнай часткай нашага грамадства, таму ўсё часцей выкарыстоўваецца як магутны інструмент масавага ўплыву.

На Беларусі большасць храмаў і манастыроў маюць афіцыйныя сайты (http://spas-monastery.by/, http://zhirovichi-monastery.by/, http://www.charity.by/ і інш.), рэгулярна абнаўляецца сайт Беларускай Праваслаўнай царквы http://www.church.by/. Вядучыя СМІ Беларускай праваслаўнай царквы маюць свае старонкі і парталы: часопіс «Минские епархиальные ведомости», часопіс мінскіх духоўных школ «Ступени» http://www.stupeny.com/, добра вядомыя праваслаўнаму чытачу газеты «Церковное слово» http://sppsobor.by/word/all-issues, «Преображение» http://apostol.by і «Воскресение» http://oroik.by/gazeta-voskresenie/, часопісы «Врата Небесные», «Фома», «Поколение», а таксама дзіцячы часопіс «Колыбель», які выдае Навагрудская епархія http://www.eparhia.by/nashi-smi/detskii-zhurnal-kolybel.html.

Якасна працуе таксама праваслаўны інфармацыйны партал http://www.sobor.by/, сайт Сінадальнага паломніцкага аддзела http://piligrim.by/, "Хрысціянскі адукацыйны цэнтр імя святых Мяфодзія і Кірыла" http://www.christeducenter.by/, афіцыйны блог аб'яднання моладзі беларускай праваслаўнай царквы http://ombpc.blogspot.com.by/, сацыяльны, адзел Мінскай епархіі беларускай праваслаўнай царквы, сайт паваслаўнай архітэктуры Беларусі http://hram.by/, сайт праваслaнай бібліятэкі http://biblioteka-hram.by/.

З 2015 года ў мінскім духоўным вучылішчы з'явілася новая спецыялізацыя – "Журналістыка праваслаўных СМІ". Сэнс – навучыць веруючых журналістаў гаварыць аб праваслаўі на зразумелай мове, выкарыстоўваць вопыт Царквы ў ацэнцы падзей.

Як ужо адзначалася, віртуальная камунікацыя закранае практычна ўсе сферы чалавечага жыцця, і сёння разнастайна прадстаўлены ў інтэрнэце жанры ўсіх функцыянальных стыляў: электронныя версіі часопісаў, тэле- і радыёперадач, чаты, блогі, e-mail, Skype інш.

Спецыфічнымі інтэрнэт-жанрамі можна назваць крэалізаваныя жанры: матыватар і дэматыватар, вэб-комікс, камічныя відэавербальныя тэксты і інш. Найбольш распаўсюджанымі і арыгінальнымі ў сацыяльных сетках з'яўляюцца матыватары. Гэта гібрыдны жанр, які надзвычай распаўсюджаны у сучаснай маладзёжнай субкультуры побач з дэматыватарамі. Цікавасць да апошняга жанра таксама вялікая: дэматыватары ствараюць, абмяркоўваюць, імі абменьваюцца. Дэматыватары – гэта выявы, што складаюцца з малюнка ці фотаздымка і надпісу-слогана. Жанр матыватара і дэматыватара патрабуе спалучэнне вербальнага і невербальнага, захаванне фармата: размяшчэнне выявы ў чорнай (дэматыватар) ці белай (матыватар) рамцы, лозунг (надрукаваны буйным шрыфтам), тлумачэнне ці цытата (надрукаваны дробным шрыфтам). У матыватарах, у адрозненне ад дэматыватараў, на першым плане вербальны складнік, візуальны выступае як другасны.

Матыватар – гэта карцінка, якая на нешта натхняе, стымулюе на дзеянне або на нейкія змены. Праваслаўны матыватар можа ўдахнаўляць на пазітыўныя змены ў дачыненні да свету, да самога сябе, дапамагае задумацца над тым ці іншым важным пытаннем. Гэта і ёсць **дабрасловы** – інтэрнэт-плакаты, якія спалучаюць фотаздымак і кароткі тэкст, матывуючы на добрыя думкі і ўчынкі. Гэтую ідэю падаў вядомы тэлевядучы і кіраўнік праваслаўнай прэс-школы «Аксіён Эсцін» Алег Лепешанкоў. Можна ўмоўна падзяліць дабрасловы на групы:

1. Дабрасловы, якія змяшчаюць у сабе цытаты са Святога Пісання, словы святых і г.д.












2. Дабрасловы, якія канстатуюць факт веры.








3. Матыватары ў вершах.






4. Дабрасловы, прысвечаныя праваслаўнай жанчыне.

Роля жанчын у Царкве ёсць тая ж, як і роля кожнага хрысціяніна, незалежна ад полу, нацыянальнага, сацыяльнага становішча, стану здароўя і г.д. – садзейнічанне Хрысту ў справе нашага збаўлення. У выніку сваіх індывідуальных талентаў жанчына можа выбраць адміністрацыйнае служэнне ў Царкве, быць багасловам, іканапісцам або кіраваць царкоўным хорам, выбраць сабе жыццё ў манаскім званні ці святасць ў высокім званні маці – але ўсё гэта толькі вонкавыя выявы некаторых аспектаў жыцця хрысціяніна. Галоўнае ж-гэта «шчырасць сэрца ў нятленным характве лагоднага і маўклівага духу, што каштоўна перад Богам» (1 Пятра 3: 4). Таму што цела Хрыста складаецца не з адміністратараў,

багасловаў або іканапісцаў, нават не са святых, але з хрысціян. І роля кожнага хрысціяніна-мужчыны або жанчыны – па словах прэп. Серафіма Сароўскага, «сцяжанне Духа Святога Божага» [2].
















5. Дабрасловы, у якіх змешчаны выказванні выбітных пісьменнікаў і філосафаў.







Відавочна, што прааналізаваныя намі праваслаўныя матыватары (дабрасловы), хоць і іграюць пэўную ролю ў распаўсюджванні праваслаўнай сімволікі, але створаны не толькі індывідуумамі Праваслаўнай Царквы, але і простымі веруючымі. У матыватарах акцэнт робіцца на праваслаўную аснову краіны, пачуццё гонару і патрыятызму (у Беларусі пачынаюць ствараць сайты і групы ў сацыяльных сетках на беларускай мове).

Праваслаўная царква паказвае сябе як суб’ект, які развіваецца і ўмела прыстасоўваецца да сучасных умоў, што за кароткі час здолеў арганізаваць на сваю карысць інтэрнэт-прастору, тым самым атрымаўшы магчымасць уплываць на вялікую колькасць моладзі.

ЛІТАРАТУРА

1. https://vk.com/batyushka_online
2. http://www.pravmir.ru/o-roli-zhenshhiny-v-cerkvi/
3. http://www.pravoslavie.ru
4. Миссионерство на «Одноклассниках.ру» [Электронный ресурс]. URL: http://www.tserkov.info/tio/?id=4410 (обращение к ресурсу 30.04.2016).